**Шэдзько, А.** Кошт жыцця / А. Шэдзько // Герой працы (Шуміліна). — 2010. — 12 лют. — С. 4.

## КОШТ ЖЫЦЦЯ

Калі гэта было? Юрый Анатольевіч Лапацін адказвае не задумваючыся: «Чэрвень 1982 года».

– Калі нас забіралі ў армію, дзень выдаўся спакойным, – успамінае ён, – але тады мы і ўявіць не маглі, што такое афганская спякота. Хлопцы тады яшчэ не ведалі, што іх чакае ў Афганістане. Пра гэта яны даведаліся ў Тэрмезе, дзе праходзілі «вучэбку».

У той чэрвень 1982 года Юрый Лапацін трапіў у Афганістан. Кабул сустрэў абстрэлам аэрадрома. «Адразу, не ступіўшы на афганскую зямлю, прайшлі агнявое хрышчэнне, – успамінае Ю. Лапацін, – з першых імгненняў пабачылі смерць».

Служыў у аўтамабільным палку. Аб’ездзіў у складзе калоны ўвесь Афганістан, давялося быць у Баграме і Хайратоне, Джалалабадзе і Кандагары… і ўсюды баі, страты.

«Да вайны нельга прывыкнуць, смерць сяброў ніколі не стане абыдзенасцю, – расказвае Юрый Лапацін, – за два гады зразумеў сэнс і кошт жыцця».

Таму мірнае жыццё пасля Афганістана стала для Юрыя Лапаціна сапраўдным шчасцем.

Можа таму і прафесію ён абраў самую мірную – прафесію настаўніка. А сэнс жыцця знайшоў у сям’і: разам з жонкай Надзеяй выхавалі двух сыноў.

Пра Афганістан Юрый гаворыць рэдка, імкнецца забыцца, толькі вось з гадамі боль ніяк не становіцца меншым…

**А. Шэдзько**